# Вексілалагічныя аб'екты ў сістэме грамадска-палітычных адносін Вялікага Княства Літоўскага з сярэдзіны XVI да канца XVIII ст.

**А. Л. Шулаеў,**
аспірант,
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы

*Вексілалогія – спецыяльная навуковая гістарычная дысцыпліна, якая вывучае гэтак званыя вексілалагічныя аб'екты (сцягі і аб'екты, блізкія да іх па функцыях, вексілоіды, транспаранты, харугвы, штандары, вымпелы і г. д.), а таксама комплексы ўяўленняў датычна сцягоў або спадарожных да іх рэчаў, традыцыі і рытуалы.*

Тэрмін «вексілалогія» ўпершыню сфармуляваў амерыканскі даследчык У. Сміт у артыкуле «Сцягі Арабскага Свету» (*Smith, W.* Flags of the Arab World / W. Smith // The Arab World Magazine 5. – 1958. – № 10. – S. 12–13), што можна лічыць адпраўной кропкай новай гістарычнай дысцыпліны. Сярод публікацый па тэме вексілалогіі вылучаюцца як айчынныя, так і з блізкага замежжа.

**Польшча.** Вексілалагічныя аб'екты ў кантэксце вывучэння геральдыкі аналізуюцца, напрыклад, у манаграфіі С. К. Кучыньскага (*Kuczyński, S. K.* Polskie herby ziemskie. Geneza, treści, funkcje / S. K. Kuczyński. – Warszawa: Wyd-wo naukowe PWN, 1993. – 336 s.). Таксама варта адзначыць працы А. Знамяроўскага (*Znamierowski, A.* Stworzony do chwały / A. Znamierowski. – Warszawa: Editions Spotkania, Paryż, 1995. – 299 s.; *Znamierowski, A.* Insygnia, symbole i herby polskie. Warszawa: Świat Książki, 2003. – 215 s. і інш.). Згаданыя працы аб'ядноўвае разгляд вексілалагічнай спадчыны ў кантэксце іншых гістарычных навук, напрыклад, геральдыкі, уніфармалогіі, гісторыі вайсковай стратэгіі.

Асобна стаіць праца Я. Птака (*Ptak, J.* Weksylologia polska. Zarys problematyki / J. Ptak. – Warszawa: Wyd-wo DiG, 2016. – 300 s.), у якой зроблена спроба акрэсліць асноўныя тыпы і групы вексілалагічных аб'ектаў, вылучаны групы такіх аб'ектаў паводле функцыянальнага прызначэння, пералічаны пэўныя характарыстыкі вексілалагічных аб'ектаў.

**Расійская Федэрацыя.** Сярод сучасных расійскіх даследчыкаў вексілалогіі можна згадаць А. Басава (*Басов, А.* Военно-морские флаги / А. Басов // Детская военно-морская энциклопедия. – СПб.; М.: Олма-Пресс, 2002. – Т. 2: Современный флот. – С. 608–632), Ц. М. Шэвякова (*Шевяков, Т.* Знамена и штандарты Российской императорской армии конца XIX – начала XX в. / Т. Шевяков, О. Пархаев. – М.: Изд-во «АСТ»: Астрель, 2002. – 48 с.), П. К. Карнакова (Реликвии борьбы и труда: Каталог знамен музея Великой Октябрьской социалистической революции / сост. П. К. Корнаков, Э. Ф. Мичурина. – Л.: Лениздат, 1985. – 136 с.; *Корнаков, П. К.* История создания знаменной системы Вооруженных сил Российской Федерации / П. К. Корнаков // IN HOC SIGNO VINCES: материалы Междунар. вексиллол. симпозиума (21–22 мая 2012 г. и 27–28 мая 2015 г.) / Гос. Эрмитаж. – СПб.: Изд-во Гос. Эрмитажа, 2017. – С. 76–88) і інш.

**Украіна.** Сярод прац украінскіх даследчыкаў па вексілалогіі варта адзначыць найперш працу Ю. Саўчука (*Савчук, Ю.* Одіссея козацьких прапорів / Ю. Савчук. – Стокгольм: Військ. музей Швеції, 2012), Б. Якімовіча (*Якимович, Б.* Українська вексилологічна терміносистема / Б. Якимович // Третя наукова геральдична конференція: зб. тез, повідомлень та доповідей. – Львів: Україн. геральд. т-во, 1993. – С. 113–114), Б. Краўчанкі (*Krawchenko, B.* National memory in Ukraine: The Role of the Blue and Yellow Flag / B. Krawchenko // Journal of Ukrainian Studies. – 1990. – Vol. 15, № 1. – P. 1–21), а таксама працы Нацыянальнага музея ў Львове імя Андрэя Шаптыцкага (*Косів, Р.* Українські хоругви / Р. Косів. – Київ: Оранта, 2009. – 372 с.) і інш. Пералічаныя даследаванні, па-першае, даследуюць даволі вузкі сегмент вексілалагічных аб'ектаў, а менавіта казацкія сцягі, рэлігійныя (найперш праваслаўныя і грэка-каталіцкія) харугвы, украінскія нацыянальныя сцягі з пачатку XX ст.; па-другое, у іх робіцца акцэнт на вывучэнні сцягоў альбо ў кантэксце музейнай справы, альбо ў кантэксце іншых навук (геральдыкі, уніфармалогіі і інш.).

**Літоўская Рэспубліка.** Сярод даследчыкаў можна згадаць Э. Рымшу (*Rimša, E.* Heraldika: iš praeities į dabartį / E. Rimša. – 2-oji papild. laida. – Vilnius: Versus aureus, 2004. – 188 p.; *Rimša, E.* Lietuvos heraldika / E. Rimša. – Vilnius: Baltos lankos, 2008. – 526 p.).

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 23.06.2023.

**Рэспубліка Беларусь.** Вексілалогіі і вексілалагічным аб'ектам прысвечаны наступныя кнігі: *Басаў, А.* Флагі Беларусі ўчора і сёння / А. Басаў, І. Куркоў; пер. А. Н. Найдовіч. – Мінск: Полымя, 1994. – 34 с.; *Рассадзін, С.* Гербы і сцягі гарадоў і раёнаў Беларусі / С. Я. Рассадзін, А. М. Міхальчанка. – Мінск: Беларусь, 2005. – 128 с.; *Цітоў, А.* Геральдыка Беларусі / А. Цітоў. – Мінск: МФЦП, 2010. – 144 с.; *Шула-Сянчэўскі, А.* Сцягі княскага роду Радзівілаў XVI–XX стагоддзяў / А. Шула-Сянчэўскі. – Мінск: Альфа-кніга, 2019. – 120 с.

Сярод навуковых публікацый можна выдзеліць наступныя: *Шаланда, А.* «Banderia Lithwanorum et Ruthenorum»: да праблемы сімволікі харугваў ВКЛ у бітве пад Грунвальдам у 1410 г. / А. Шаланда // Сімвалы і гербы зямель Беларусі ў X–XVIII стст.: геральдычна-сфрагістычныя нарысы / А. Шаланда. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2013. – 182 с.; *Мяцеліца, К.* Беларуская вексілалагічная тэрміналогія ў XVI–XVII стст.: вытокі і асаблівасці / К. Мяцеліца // Гістарычна-археалагічны зборнік = Historical-archeological collection / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – 2019. – Вып. 34. – С. 159–163.

Аналіз кніг і публікацый паказвае, што ім уласцівы разгляд паасобных сцягоў ці груп сцягоў, аналіз сцягоў у кантэксце іншых навуковых дысцыплін, напрыклад геральдыкі, адсутнасць комплекснага аналізу вексілалагічных крыніц.

Гаворачы пра вывучэнне ролі вексілалагічных аб'ектаў у сістэме грамадска-палітычных адносін, мы найперш гаворым пра спробу рэканструяваць вексілалагічную традыцыю, якая сама па сабе не была зафіксаваная ў складзе якога-небудзь гістарычнага дакумента, але пакінула сляды ў гістарычных крыніцах і на музейных экспанатах.

Відавочна, што вексілалагічная традыцыя на тутэйшых землях сягае ў часы Полацкага княства і нават раней. Так, найранейшыя выявы сцягоў з тэрыторыі Беларусі датуюцца 10-мі гадамі X ст. Разам з тым толькі з сярэдзіны XVI ст., калі пачынае з'яўляцца вялікая колькасць мясцовых друкаваных выданняў у сукупнасці з тэкстамі, якія верыфікуюць згаданыя выявы, мы можам гаварыць пра магчымасць правядзення комплекснага аналізу рудыментаў вексілалагічнай традыцыі ВКЛ.

Гаворачы пра вексілалагічную традыцыю, неабходна найперш выдзеліць у ёй падзел вексілалагічнай практыкі падчас вайны і ў мірны час. У першым выпадку сцяг выконваў традыцыйную для яго ролю сігнальна-апазнавальнага знака, вакол якога гуртавалася адпаведная вайсковая адзінка, у другім – сцяг, як правіла, адыгрываў ролю аб'яднаўчага сімвала палітычнай эліты пэўнай акругі. Для шляхецкага стану, чые выбарнае правы і прывілеі ішлі поруч з абавязкам нясення вайсковай павіннасці на карысць абароны краю, сцяг валодаў пэўным дуалізмам, сімвалізуючы збор на сейміке і сеймы пад той жа харугвай, што і на полі бою.

**Вексілалагічная традыцыя падчас вайны**

Кожная харугва, рота і кампанія павінна была мець уласны сцяг, прычым жаўнеры пэўнай вайсковай адзінкі павінны былі берагчы свой сцяг нават коштам уласнага жыцця [1, s. 74]. Сцяг адыгрываў ролю апазнавання на полі бою, прычым не толькі для сваіх, але і для непрыяцеля: «Хлопцы, са мной на чале занясіце арла Радзівілаў аж да варожых муроў, і давайце агледзім лагчыны» [2, с. 468], меў сігнальныя функцыі. Разам з тым у войску сцягамі пазначаліся не толькі вайсковыя адзінкі, але і вайсковыя абозы, што зафіксавана ў інвентарных вопісах: «Chorągiewek do wytknęcia Obozu należy sztuk 18» [3].

Важны элемент вексілалагічнай традыцыі мы атрымліваем пры вывучэнні аўтэнтычных палотнішчаў у музейных калекцыях, дзе частка сцягавых палотнішчаў прыбітая да тронка неспецыфічным бокам (правым бокам, заміж левага, з пераварочваннем сцяга наадварот, а таксама нізам палотнішча). Такая практыка, відавочна, была пашыраная падчас бою, калі пад шквальным агнём палотнішча сцяга адрывалася ад тронка, але зноў завешвалася да яго непашкоджаным бокам як знак працягу змагання. Знаходзім такія ў калекцыі Вайсковага музея ў Стакгольме (Швецыя) пад інвентарнымі нумарамі ST 28:63 і ST 30:166,2.

З вывучэння аўтэнтычных вексілалагічных аб'ектаў мы таксама бачым, што абсалютная большасць палотнішчаў прыбітыя да тронкаў з дапамогай цвікоў, датычна чаго існуе старажытная традыцыя ўрачыстага набівання палотнішча на тронак. Сёння складана гаварыць, ці было набіванне палотнішча менавіта ўрачыстым актам, але, з улікам распаўсюджанасці такой практыкі па ўсёй Еўропе, гэта цалкам магчыма. Таксама агульнаеўрапейскай практыкай было выкарыстанне белага сцяга для перамір'я. Згадкі пра такую практыку знаходзім і ў айчынных крыніцах: «І, калі б не заможнасць легатаў, Белы іх сцяг, – мусіць, ён не ўстрымаўся б ад новых забойстваў» [2, с. 456].

Зазначым таксама, што для Еўропы ў другой палове XVII–XVIII ст. было ўжо цалкам нетыповым выкарыстанне агромністых сцягавых кавалерыйскіх палотнішчаў і ўвогуле цяжкай кавалерыі, што, аднак, было вельмі распаўсюджаным і традыцыйным для ВКЛ і, шырэй, Рэчы Паспалітай. Наш край, такім чынам, успрымаўся ў тагачаснай Еўропе як своеасаблівы архаічны запаведнік рыцарства, пры тым што ў Вялікім Княстве такая традыцыя ўспрымалася цалкам арганічнай у кантэксце папулярных тады традыцый сарматызму. Славуты паэт Ян Радван у паэме «Радзівіліяда, або Пра жыццё і дзеі, слаўныя подзвігі бессмяротнай памяці найсвятлейшага пана Мікалая Радзівіла...» усяляк падкрэсліваў сармацкія традыцыі ўласнага народа: «Трэба спыніць весялосць, уздымайце штандары, сарматы» [2, с. 457].

Цалкам лагічнай для агульнаеўрапейскай традыцыі была рэпрэзентацыя войска і сцягоў Вялікага Княства Літоўскага ў рэчышчы хрысціянскай традыцыі, што не супярэчыла канцэпцыі сарматызму: «Так

пачалася вайна. Вось сюды і прыводзіць Георгій Войска свае і сцягі» [2, с. 438].

Надзвычай важным для разумення вексілалагічнай традыцыі ВКЛ і, шырэй, Рэчы Паспалітай у кантэксце вексілалогіі з'яўляецца наяўнасць усходніх, часта зусім нетыповых для Еўропы элементаў. Так, апроч усходніх дэкаратыўных элементаў, на палотнішчах сцягоў у войску выкарыстоўваўся ўсходні вексілалагічны аб'ект – бунчук (пра бунчук). З'яўляючыся першапачаткова цалкам усходнім элементам, уласцівым мусульманам, бунчук з цягам часу набываў мясцовыя рысы і нават рысы хрысціянскага культу і паступова трансфармаваўся ў падобны, але ўсё ж адрозны аб'ект – гетманскі знак [4, s. 59–93]. Пры гэтым у вексілалагічных зборах мы знаходзім і бунчукі з адпаведнымі хрысціянскімі і мусульманскімі элементамі: калекцыя бунчукоў са скарбніцы Любчанскага замка, апісаная ў Інвентары за 1633 г.: «бунчук з конскага воласу з шарам з чыстага золата, з Пеліканам, дыяментамі, рубінкамі і тапазікамі насаджанымі»; «бунчук з конскага воласу з шарам срэбным залацістым грушкаватым, сталлю набітым»; «бунчук з трыма кутасамі ніткавымі з дзевяццю перлавымі шарамі, на табліцы срэбнай залацістай»; тры «бунчукі з конскага воласу белыя», адзін з якіх меў шар срэбны залачоны, упрыгожаны рубінкамі і бірузой, іншы мае «касічку чорную з шарам срэбным залацістым у кратку разлінаваным» трэці, меншы бунчук, меў «шар залачоны»; «бончук акруглы, срэбны залацісты з арлом і з двума званочкамі, з трыма ланцужкамі белымі, з кутасамі трыма золатам і срэбрам расшытымі»; «бончук з ікламі, на шары срэбным, на якім месяц і зорка срэбныя месцамі залацісты, маляваны, апраўлены, чые кутасы расшытыя былі золатам і срэбрам» [5].

Нарэшце, у мясцовай вексілалагічнай традыцыі прысутнічалі ўсходнееўрапейскія, у дадзеным выпадку венгерскія, элементы, неўласцівыя іншым еўрапейскім краінам таго часу: у апісанні паходу Стэфана Баторыя 1581 г., складзеным адным з яго сакратароў Янам Пятроўскім, быў зафіксаваны гетманскі знак у выглядзе венгерскай шапкі: «П(ан) Гетман новы <…> сам роты ставіў, ездзіў як гетман і канцлер, пячатка на шыі, а гетманскі прапорчык за ім: на гроце ў дзіды, чырвоная магерка з пер'ем, на прапорчыку рыфма: "Бог мужнасцю маёй і хвалою» [6]. Вывешванне шапкі гетманскай як гетманскага знака фіксуецца таксама ў 1580, 1620, 1646 гг., г. зн. на працягу даволі вялікага часу, што гаворыць пра ўстойлівасць традыцыі. Рудымент гэтай традыцыі захаваўся па сённяшні дзень у выглядзе элемента вексілалагічных аб'ектаў пад назвай «кутас» (дэкаратыўны элемент у выглядзе пэндзліка першапачаткова з пучка конскіх валасоў, пазней – нітак, звязаных на адным канцы. Выкарыстоўваецца для ўпрыгожвання касіц і іншых элементаў палотнішча, а таксама стужак і шнуроў, што завешваюцца да тронка).

Важнай часткай вексілалагічнай традыцыі ў вайсковым кантэксце былі правілы абыходжання з трафейнымі сцягамі непрыяцеля. Тут трэба падзяляць сітуацыі, калі сцягі забіраліся ў непрыяцеля, і калі пакідаліся яму. У другой сітуацыі выконваўся акт сімвалічнай знявагі непрыяцельскіх сцягоў, як, напрыклад, было запісана ў Пунктах ад Камісараў пры здачы Берасця Літоўскага: «п. 2. Выходзячы павінныя будуць Харугвы кідаць пад ногі Паноў Камісараў, а потым іх скруціць і на вазы пакласці, і ня маюць іх раскручваць аж пакуль не даедуць да мяжы» [7, s. 39].

У сітуацыі, калі непрыяцельскія сцягі забіраліся ці падчас, ці пасля бою, здабытыя сцягі на працягу 30 гадзін павінны былі быць перададзены гетману [1, s. 74]. Па заканчэнні вайсковай кампаніі, як правіла, захопленыя непрыяцельскія сцягі дараваліся манарху. Тут згадаем калекцыю казацкіх сцягоў, што ў якасці трафеяў узяў князь Януш II Радзівіл (1612–1655) падчас свайго паходу на Кіеў у 1651 г. і затым падараваў каралю польскаму і вялікаму князю літоўскаму Яну III Казіміру Вазе [8].

Нельга не згадаць, што крыніцы фіксуюць сімвалічны спосаб павяртання ўласным сцягам, што зазналі паразу і знявагу падчас вайны, былога ўганаравання праз выкарыстанне іх у новых, пераможных бітвах: «Меў ён натхніць грамадзян непахіснаю верай, узняўшы Тыя харугвы ізноў, што быў вораг парваў на Вядрошы» (тут гаворка вядзецца пра бітву на рацэ Вядрошы, недалёка ад Дарагабужа (на Смаленшчыне), якая адбылася 14.07.1500 г. і ў якой войска князя Астрожскага атрымала паразу, а сам гетман трапіў у палон) [2, с. 436].

Разам з тым трафейныя вексілалагічныя аб'екты вельмі часта адыгрывалі ролю дыпламатычнага інструмента. Так, князь Багуслаў Радзівіл (1620–1669) у сваёй аўтабіяграфіі занатаваў, што 23 сакавіка 1659 г. падчас вайны, празванай Патопам (1654–1667), захапіў у Лібштаце ў шведаў 8 харугваў і 2 корнеты, а 9 красавіка 1660 г. падараваў Фрыдрыху Вільгельму I, курфюрсту Брандэнбургскаму, якога лічыў сваім пакравіцелем, у Берліне ўжо 32 харугвы і 3 корнеты. Укладаецца ў гэты шэраг таксама сімвалічны падарунак трафейнай асманскай харугвы, узятай у бітве пад Венай (12.09.1683) Папам Рымскім, вялікаму князю і каралю Яну Сабескаму ў XVIII ст.

Так ці інакш, завяршэннем шляху трафейных сцягоў, як правіла, было ўрачыстае вывешванне і захаванне іх у кальтавых збудаваннях, аб чым маем наступнае гістарычнае сведчанне: «І калі ў 1529 годзе ўся Вільна згарэла дашчэнту, <…> Тут у саборнай царкве блажэннага Станіслава, крытай свінцом з залачонымі вярхамі, <…> разам са шматлікімі залатымі, срэбнымі сасудамі згарэла і каля трохсот старажытных сцягоў, здабытых у перамогах над раксаланамі, масквіцянамі, алеманамі і іншымі народамі. Пасля перамогі над масквіцянамі пры Оршы ў дзень Раства Дзевы Марыі, 8 верасня 1514 г., калі забітых ды ўзятых у палон было восемдзесят тысячаў, да гэтых сцягоў былі дададзеныя яшчэ 12» [9, с. 96].

Не мінула вексілалагічная традыцыя і нетыповыя для нашых земляў марскія сцягі. Найбольш гістарычных крыніц у гэтым кантэксце звязана са спробай краіны займець уласны вайсковы флот на Балтыйскім моры ў першай палове XVII ст. Нягледзячы на тое, што флот будаваўся на гданьскіх верфях, гэта не быў флот выключна Кароны Польскай, бо, па-першае, будаваўся на грошы Вялікага Княства Літоўскага і дзеля абароны, у тым ліку яго інтарэсаў пры імпарце тавараў у Еўропу, па-другое, і сам склад каманд караблёў быў агульнадзяржаўны, і сам Гданьск карыстаўся правам экстэрытарыяльнасці, прызнаючы над сабой уладу краіны ў цэлым, але не ўладу асобна манарха ці асобна Каралеўства Польскага. Сярод важнай агульнаеўрапейскай вексілалагічнай традыцыі можна таксама назваць традыцыю падымання на карме карабля сігнальнага сцяга, які называўся Крывавым сцягам (нідэр. *bloedvlag*, англ. *bloody flag*, ням. *Blutflagge*, швед. *blodsflaggan*, дац. *blodflag*). Крывавы сцяг уяўляў сабой першапачаткова проста чырвонае палотнішча, на якое пазней пачалі дадаваць Правіцу божую (Dextera Domini), і як традыцыя з'явіўся ў Нідэрландах, а пасля распаўсюдзіўся па ўсім свеце [10].

### Вексілалагічная традыцыя ў мірны час

У мірны час значэнне вексілалагічных аб'ектаў было не менш важным, чым падчас вайны. Так, харугвы земскага войска сімвалізавалі абавязак палітычнага стану дзяржавы – шляхты – збірацца пад харугвай на сеймікі і сеймы, плаціць падатак крывёю і ўдзельнічаць у палітычным жыцці краіны, на сімвалічным узроўні паказвалі адзінства земляў Вялікага Княства Літоўскага праз візуальную тоеснасць сваіх стандартызаваных палотнішчаў [11, s. 299–430]. У такой сваёй ролі харугвы земскага войска (паспалітага рушання) прысутнічалі на ўсіх важных этапах функцыянавання манаршай улады: элекцыя і каранацыя новага манарха, заключэнне дынастычных шлюбаў, урачыстая жалоба і пахаванне членаў манаршай сям'і і важных асоб краіны і інш.

Важнымі для разумення мясцовай вексілалагічнай традыцыі элементамі, якія, апроч іншага, адсылалі да антычнай традыцыі, былі гэтак званыя трыумфы. Трыумф (лац. *triumphus*) – першапачаткова ганаровы ўваход у сталіцу пераможнага палкаводца і яго войска ў Рымскай імперыі, абумоўлены шэрагам умоў і нормаў. У Вялікім Княстве Літоўскім і, шырэй, Рэчы Паспалітай трыумф, з аднаго боку, з'яўляўся своеасаблівай данінай рэнесансным традыцыям і падкрэсліваў пераемнасць паміж старажытным Рымам і мясцовымі элітамі традыцый дзяржаўнасці, з іншага – першапачатковы сэнс трыумфу як урачыстага ўваходжання ў сталіцу войска-пераможцы быў забыты, пакінуўшы непасрэдна сімвалічны акт урачыстага ўваходжання, якое адбывалася, напрыклад, з нагоды дынастычнага шлюбу манарха, першага наведвання манархам месца, прычым не абавязкова сталічнага, уваходжання ў месца пасольства даверанай манархам асобы і г. д.

Арганізацыю трыумфу ў тыя часы ілюструе гэтак званая Ролька Стакгольмская (іншыя назвы: Ролька Польская, Ролька вазаўская) – урачыстая працэсія ўваходжання ў Кракаў караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта ІІІ Вазы на чале шлюбнай працэсіі Канстанцыі Аўстрыячкі, каралевы польскай і вялікай княгіні літоўскай. Ролька ўяўляе сабой паліхромны аднабаковы малюнак памерам 15 000 × 280 мм, датаваны 1605 г., намаляваны акварэллю, гуашшу, залатой фарбай на паперы (аўтар малюнка невядомы). Ролька захоўваецца ў калекцыі Замка каралеўскага ў Варшаве (інвентарны нумар ZKW/1528). На малюнку выяўлена ўрачыстая працэсія з манаршых асоб, іх світы і аховы, прысутнічаюць шматлікія дэтальна прамаляваныя вексілалагічныя аб'екты, у тым ліку 1 ганфалон (галоўны сцяг), 8 значыкаў (спецыяльныя сцяжкі, што завешваліся на фанфары і барабаны), 126 гусарскіх вымпелаў, 12 харугваў, сярод якіх сцяг каралеўскай харугвы, сцяг атрада дзясятнікаў, сцягі міліцыі места Кракава, Страдама і інш. Важным момантам з'яўляецца тое, што ў трафейнай калекцыі Вайсковага музея ў Стакгольме захавалася аўтэнтычнае палотнішча ганфалона, паказанага на Рольцы (інвентарны нумар E 231, ST 28:3). Праведзенае параўнанне аўтэнтычнага палотнішча з яго выявай на Рольцы дазваляе зрабіць выснову пра дакладнасць і ўважлівасць з боку мастака пры выяўленні вексілалагічных аб'ектаў. Аналіз Ролькі паказвае, што вексілалагічныя аб'екты на ёй адыгрывалі найбольш важнае значэнне для самарэпрэзентацыі як манаршай асобы, так і ўсяго шляхецкага стану і органаў мясцовага самакіравання.

Самарэпрэзентацыі краіны на міжнародным узроўні служылі наступныя трыумфы ў значэнні ганаровага ўваходжання, пасольстваў Вялікага Княства Літоўскага і, шырэй, Рэчы Паспалітай, якія дайшлі да нашага часу ў выглядзе гравюр:

- трыумф пасольства Ежы Асалінскага да Рыму ў 1633 г. аўтарства Стэфана Дэлля Белла;
- трыумф пасольства Пятра Патоцкага ў Стамбул 31.03.1790 г.;
- трыумф пасольства князя Міхала Казіміра Радзівіла Рыбанькі да Вены ў 1679 г. На гравюры паказаны парад войска Радзівілаўскага. Маюцца дэтальна прамаляваныя выявы вексілалагічных аб'ектаў: 1 гетманскі ганфалон, 2 сігны (тып вексілалагічнага аб'екта ў выглядзе скульптурнай кампазіцыі на тронку), 2 пяхотныя харугвы, 1 кавалерыйскі штандар «на прускі манер», 2 гусарскія ротныя штандары, 64 гусарскія вымпелы, 6 вярблюджых вымпелаў (у склад парада ўключаны сапраўдныя вярблюды).

Прыведзеныя вышэй прыклады сведчаць пра важнасць і неад'емнасць вексілалагічных аб'ектаў для самарэпрэзентацыі краіны.

Цікавым прыкладам, звязаным з самарэпрэзентацыяй манарха краіны на міжнароднай палітычнай

арэне, з'яўляецца наяўнасць двух кармавых сцягоў (кармавыя сцягі на флоце пазначалі дзяржаўную прыналежнасць карабля) на віцэ-адміральскім караблі «Кароль Давыд» вайсковага флоту вялікага князя літоўскага і караля польскага Жыгімонта III Вазы: адзін з іх паўтараў сцяг Каралеўства Швецыі, а другі насіў на сабе дзяржаўны герб Рэчы Паспалітай. Згадку пра наяўнасць такіх сцягоў знаходзім у інвентары ад 1629 г., складзеным у порце горада Вісмар пры перадачы караблёў флоту Жыгімонта III у склад флоту Альбрэхта фон Валенштайна, генералісімуса імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі Фердынанда II паводле раней заключанага міждзяржаўнага пагаднення [12, s. 301–320]. Прычынай таго, што карабель меў адначасова сцягі, якія маглі пазначаць яго і як карабель флоту Рэчы Паспалітай, і як карабель флоту Швецыі, магчыма, з'яўляюцца дзяржаўныя прэтэнзіі самога Жыгімонта III Вазы на стальцы кароны Швецыі, дзе мелася вялікая колькасць лаяльных Жыгімонту грамадзян, і Рэчы Паспалітай. Гэта значыць, што ў кожнай спецыфічнай сітуацыі капітан карабля мог вывешваць пэўны кармавы сцяг з мэтай прадэманстраваць палітычныя правы Жыгімонта Вазы альбо на сталец Швецыі, альбо на сталец Рэчы Паспалітай.

Згадаем таксама пра вывучэнне гэтак званых сармацкіх партрэтаў Вялікага Княства Літоўскага і, шырэй, Рэчы Паспалітай. Сцягі на такіх партрэтах амаль не сустракаюцца, за рэдкім выключэннем, калі, напрыклад, асоба, выяўленая на партрэце, з'яўлялася харунжым, гэта значыць калі апека над сцягам была абавязкам выяўленай асобы. І наадварот, сцягі часта і ў вялікай колькасці прысутнічаюць на карцінах, дзе паказваецца войска краіны ці збор палітычнага стану краіны падчас важнай падзеі, напрыклад, элекцыі манарха. З гэтага можна зрабіць выснову, што вексілалагічны аб'ект успрымаўся не як рэч і з'ява індывідуальная, а як рэч і з'ява калектыўная, прыналежная палітычнаму стану краіны і краіне ў цэлым.

На думку аўтара, важны аспект вывучэння вексілалагічнай традыцыі ВКЛ – складанне спісу практычных прапаноў для Службы дзяржаўнага пратакола Рэспублікі Беларусь. Справа ў тым, што практычна ўсе нашы суседзі маюць адпаведныя нарматывы, распрацаваныя і гістарычна абгрунтаваныя для ўласных пратакольных службаў і ганаровых рот. Аўтар ставіць перад сабой мэту распачаць працу над такім пратаколам у кантэксце даследавання вексілалагічных аб'ектаў.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Wisner, H.* Wojsko litewskie 1 połowy XVII w. Cz. 2. / H. Wisner // Studia i Materiały do Historii Wojskowości. – 1976. – T. XX.

2. Літаратура XI–XVI стагоддзяў / А. У. Бразгуноў [і інш.]; пад навук. рэд. В. А. Чамярыцкага. – Мінск: Маст. літ., 2012. – 766 с.

3. Archiwum Główne Akt Dawnych [Electronic resource] // szukajwarchiwach.gov.pl. – Mode of access: https://www.szukajwarchiwach.gov.pl/jednostka/-/jednostka/17894924. – Date of access: 24.10.2021.

4. *Łopatecki, K.* Znak hetmanski: geneza, funkcje, symbolika / K. Łopatecki // Studia i Materiały do Historii Wojskowości. – Białystok: Ośrodek Badań Historii Wojskowej Muzeum Wojska, 2005. – T. 42.

5. *Życiński, S.* Broń I oznaki władzy wojskowej w skarbcu z lubcza 1633 r. / S. Życiński // Archeion. – 1982. – T. XXVI.

6. Piotrowski Jan Dziennik wyprawy Stefana Batorego pod Psków / A. Czuczyński. – Kraków: Nakł. księgarni spółki wydawniczej polskiej, 1894.

7. Punkta od Commissarzow K. I. M. postanowione przy oddawaniu Brześcia Litewskiego // Merkuryusz polski. – 1661. – № 5. – S. 39–40.

8. *Савчук, Ю.* Одіссея козацьких прапорів / Ю. Савчук. – Стокгольм: Військов. музей Швеції, 2012.

9. Михалон Литвин о нравах татар, литовцев и москвитян / пер. В. И. Матузовой; под ред. А. Л. Хорошкевич. – М.: Изд-во МГУ, 1994.

10. *Huflejt, M.* Dextera Domini, czyli o rzekomej banderze królewskiej Zygmunta II Augusta [Electronic resource] / M. Huflejt. – 2017. – Mode of access: https://www.bronibarwa.org.pl/artykul-marian-huflejt-dextera-domini-czyli-o-rzekomej-banderze-krolewskiej-zygmunta-ii-augusta/. – Date of access: 15.01.2020.

11. Zbiór dziejopisów polskich: we 4 t. – Warszawa: Druk. J. K. Mci y Rzeczypospolitey u XX. Societatis Jesu, 1768. – T. 4: Kronika Sarmacyi Europskiey Alexandra hrabi Gwagnina, rycerza passowanego, rotmistrza J.K.Mci niegdyś w Krakowie drukowana. – 723 s.

12. *Lepszy, K.* Inwentarz polskiej floty wojennej z 1629 r. / K. Lepszy // Kwartalnik Historii Kultury Materialnej. – 1967. – R. XV, t. 2. – S. 301–320.

**Анатацыя**

У артыкуле прааналізаваны гістарычныя крыніцы, а таксама аўтэнтычныя вексілалагічныя аб'екты з XVI да XVIII ст. у кантэксце рэканструкцыі вексілалагічнай традыцыі Вялікага Княства Літоўскага. Грунтуючыся на праведзеным аналізе, аўтар вылучае шэраг спецыфічных рыс даследуемай вексілалагічнай традыцыі і робіць выснову пра яе спецыфіку, што аб'ядноўвае як спецыфічныя заходнееўрапейскія, так і ўсходнія рысы.

**Abstract**

The author of the article analyzes historical sources, as well as authentic vexillological objects from the 16th to the 18th century in the context of the reconstruction of the vexillological tradition of the Grand Duchy of Lithuania. Based on the analysis, the author isolate a number of specific features of the studied vexillological tradition, comes to the conclusion about its specifics of both the tradition that combined both Western European and oriental specific features.